СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 29(78), 26.07-8.08.2007 г.

# ТАЙНА ШАСЦІ МІЛЬЁНАЎ

## КАЛІ ЎЗНІКЛА СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯ?



Нацыянальная ідэя пачынаецца з назвы. Таму каб адшукаць вытокі беларускай ідэі, мы мусілі б высветліць, хто й калі ўпершыню назваў сябе беларусам – у тым сэнсе, у якім ужываем гэты тэрмін мы – як самавызначэнне сябе і сваёй супольнасці, на якое адгукаюцца не толькі нашы веды, але й нашы сэрцы, наша неўсвядомленае. Гэта мусіць быць гістарычны выпадак, які стаў азарэннем і адкрыццём, а ў выніку – прэцэдэнтам, які "зачапіўся" ў пэўным коле і пачаў пашырацца на іншыя асяродкі.

Беларуская ідэя не мела гатовага гістарычнага шаблону, паводле якога трэба было, напрыклад, старадаўнюю Літву або Русь адрадзіць у выглядзе сучаснай Літвы або Русі, бо ніякай старадаўняй Беларусі – як дзяржавы — ніколі не існавала. Таксама мы не маем прыкладаў таго, каб нейкая ўлада імкнулася накінуць тутэйшаму люду імя беларусаў. Таму міф Беларусі і павінен быў узнікнуць "зніадкуль", дакладней, з цалкам ірацыянальнага зруху чыйгосьці сэрца.

Беларуская ідэя, як аб'яднанне людзей паводле роднасці гэтых самых "зрухаў сэрца", ніколі рэальна не падтрымлівалася дзяржавай і таму не вырастала да жанраў педагогікі альбо ідэалогіі, а існавала ў жанрах паэзіі, музыкі, мастацтва, часта надоўга прападала, пасля нечакана з'яўлялася зноў, іншы раз у самых нечаканых умовах і самым загадкавым чынам, але заўсёды з тым самым ірацыянальным зместам.

Менавіта так мы гэта ўсё адчуваем сёння. Але ці так яно было насамрэч?

* * *

Псіхалагічна, калі мы называем сябе беларусамі, мы перажываем пачуццё роднасці з іншымі, хто таксама называе сябе беларусам, нашы сэрцы б'юцца ва ўнісон, мы маем на ўвазе нешта неўсвядомленае, але такое самае. Калі ж адзін з нас называецца беларусам, а іншы літвінам, русінам, тутэйшым ці магілёўцам, мы не перажываем пачуццё адзінства, бо адносім сябе да розных груп. У найлепшым выпадку гэта пачуццё суседства.

Найчасцей за пункт адліку беларускай ідэі бярэцца "Прадмова" віленскага адваката Францішка Багушэвіча да ягонага паэтычнага зборніка "Дудка беларуская", дзе аўтар растлумачыў, што нашу "мужыцкую" мову трэба называць беларускай, і

Працяг на стар.4.

## ЦІ ЎМЕЮЦЬ БЕЛАРУСЫ АДПАЧЫВАЦЬ?

АПЫТАННЕ НА СТАР. 2

## ТРУНА З КАНДЫЦЫЯНЕРАМ

АГЛЯД НА СТАР.6

# ЦІ ЎМЕЮЦЬ БЕЛАРУСЫ АДПАЧЫВАЦЬ?

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## “ЯНЫ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЮЦЬ ГЭТАМУ ВУЧЫЦЦА”

Я гатовы адказаць катэгарычна – не. Яны толькі пачынаюць гэтаму вучыцца. Але ў традыцыях беларусаў адпачынку, як такога, не было. У традыцыйнай культуры, прынамсі. Беларусы альбо працуюць, альбо п’юць гарэлку. Але каб на цвярозую галаву забаўляцца... ім гэта да галавы не прыходзіць. І таму яны ніводнай гульні, акрамя хованак, і не прыдумалі. Ці-то ад ворагаў, ці-то ад саміх сябе. Адпачынак звязаны з заможным класам. У эпоху ВКЛ і ранейшыя, калі ў нас была свая шляхта, яна, бясспрэчна, мела сваю культуру адпачынку. А нізавыя, плебейскія слаі не мелі такой магчымасці. Не было адкуль узяцца культуры адпачынку. З адпачынкам звязаныя толькі рэлігійныя святы. Паколькі ў нядзелю працаваць забаранялася, беларускі чалавек мусіў, як бы, адпачываць. Але нават у нядзелю ён не адпачываў, а імітаваў адпачынак. А найпрасцейшая імітацыя адпачынку – гэта ўзяць чарку. А калі беларускі чалавек не выпіваў, дык чакаў панядзелка, каб хутчэй пачаць што-небудзь рабіць. І вось зараз, у сувязі з ростам заможнасці, пакрысе пачынаюць напрацоўвацца розныя формы адпачынку. Адна з формаў, якая проста неверагодна выбухнула, і якой беларусы пачалі карыстацца масава, звязаная якраз з турызмам, з вандроўкамі. Нават тыя бясконцыя выезды на шашлык – гэта таксама адна з формаў культуры адпачынку, якая ўваходзіць у праграму жыцця.

**ЯЎГЕН, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## “СУР’ЁЗНАСЦЬ НЕ ДАЕ ІМ АДПАЧЫВАЦЬ”

На маю думку, у беларусаў няма святаў. Усё, што яны робяць, робіцца праз перашкоды. Калі яны працуюць, яны працуюць так, што на іх глядзець прыемна. І калі яны адпачываюць, дык трэба так адпачываць, як апошні раз. Для беларусаў адпачынак – гэта не рэлаксацыя, а таксама праца па адпачынку. Стаяць у чэргах па піва, выстаяць ці не ўсе каруселі, схадзіць на ўсе мерапрыемствы. Беларусы – людзі сур’ёзныя. І гэтая сур’ёзнасць ім не дае нармальна ні працаваць, ні адпачываць.

**АЛЕГ ГАРБУЗ, АКЦЁР ТЭАТРА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ:**

## “АДПАЧЫНАК У НАС – ГЭТА ГРАМАЎ СЕМСОТ”

Я асабіста не ўмею адпачываць. І тое, што я бачу навокал, таксама адпачынкам назваць не магу. Я маю на ўвазе ўсе гэтыя масавыя святы. Алачынак у нас — гэта грамаў семсот. Нямногія з нас гатовыя ўзяць човен і сплавіцца па рацэ. Такіх у нас адзінкі. Народу проста невядома, што такое “адпачываць”.

**ТАМАРА, НАСТАЎНІЦА:**

## “ГЭТА НЕ АДПАЧЫНАК, А ПАКУТА”

Як адпачываюць аргентынцы ці бразільцы? Танга, самаба, пасадоблі ўсякія.

Вось у каго варта павучыцца. Напэўна, па аналогіі, у нас павінны быць свае святы гарадоў і мястэчак. На якіх будуць масава гатавацца мясцовыя стравы, ліцца сваё піва. І ўсё гэта пад “Лявоніху” з “Полькай”. А тое, што адбываецца зараз – жлуктанне гарэлкі пад гнюсную папсу – гэта не адпачынак а пакута.

**ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ, АРТЫСТ, СПЯВАК:**

## “ГЛЕДЗЯЧЫ, ШТО ЛІЧЫЦЬ АДПАЧЫНКАМ”

Гледзячы, што лічыць адпачынкам. Калі ў чалавека вельмі нервовая праца, ён набірае вядро шашлыкоў, скрыню гарэлкі, вясёлых дзяўчат, і едзе адпачываць. Гэта адзін спосаб. Другі, калі людзі збіраюцца цэлымі сем’ямі і едуць у Кракаў, у Прагу. Я лічу, што адпачываць у нас, канечне, умеюць. Зараз сялянскай, фізічнай працы, як такой, няма. Зараз праца вельмі цяжкая маральна. І чалавек адпачывае ад людзей, ад калектыву, ад адносінаў у калектыве. Ён проста ўцякае. У мяне ёсць прыяцель, які ўцякае на Браславы. Кажа – вялізнае возера і я адзін з вудай на ўсім возеры. Для яго гэта адпачынак.

**ІНЭСА, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ:**

## “КАЛІ Б БЫЛІ МАГЧЫМАСЦІ…”

Адпачываць – не працаваць. Калі б былі магчымасці, дык хапіла б і фантазіі. Бяда ў тым, што ў людзей магчымасцяў няма. Пра які сур’ёзны адпачынак можна казаць, калі звычайны паход у рэстаран – падзея. Пра ваяжы ў Венецыю і на Коста Брава памаўчу.

**ЮРЫ ХАШЧАВАЦКІ, КІНАРЭЖЫСЁР:**

## “УСЁ Ж ТАКІ ЎМЕЕМ!”

Мне цяжка за ўсіх беларусаў казаць. Мне здаецца, гэта такія працаголікі, якія, на жаль, адпачываць не могуць. У нас увогуле культуры адпачынку няма, у сувязі з нашай гісторыяй. Які ў нас быў адпачынак? Увесь ён складаўся з таго, што пару дзён трэба было паштурхацца на вакзале у чэргах, а калі прыедзеш у Сочы, трэба было займаць чаргу па білеты назад. Моладзь зараз таксама не адпачывае. Яна носіцца па свеце ў пошуку заробку… Я не ўмею адпачываць. Я адпачываю душою, калі раблю што-небудзь цікавае. Хаця, я памятаю, як да журналіста Яўгена Будзінаса прыехаў прэзідэнт фірмы “Фальксваген”. І яны пайшлі ў Дудутках да ракі. Гэта быў працоўны дзень. І раптам у прэзідэнта адвісла сківіца. Ён убачыў некалькі рыбакоў на беразе. І сказаў: “Ё маё! Як ім хараша! Летнія работы паўсюль, працы сялянскай шмат. А гэтыя сядзяць і рыбу вудзяць. Значыцца, усё ж такі ўмеем адпачываць”.

# УЛАДЫ АДЗНАЧЫЛІ ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

24 ліпеня міліцыя затрымала дзесяць маладых актывістаў за тое, што яны распаўсюджвалі ўлёткі з заклікам прыняць удзел у святкаванні Дня незалежнасці ў Мінску. Усе яны былі абвінавачаныя ў дробным хуліганстве і пакараныя адміністрацыйнымі арыштамі альбо штрафамі. Напярэдадні лідэр “Маладога фронту” Павел Севярынец і Аляксей Шэін атрымалі па пятнаццаць сутак з тым самым абвінавачаннем.

Нагадаем, што сем гадоў таму, 27 ліпеня 1990 году Вярхоўны савет БССР абвесціў Дэкларацыю аб суверэнітэце. А яшчэ праз два гады Вярхоўны савет у тым самым складзе (у ім быў дэпутатам і А.Лукашэнка) зацвердзіў гэтую дату ў якасці Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і абвясціў яе дзяржаўным святам. Такім яно і заставалася на працягу пяці гадоў, пакуль у выніку рэферэндуму ўлады не абвясцілі Днём Рэспублікі 3-га ліпеня.

Заяўка апазіцыі аб правядзенні святочнага канцэрта 27 ліпеня на плошчы Бангалор была адхіленая гарвыканкамам.

Арганізатары святкавання вырашылі правесці ў гэты дзень а 16-й гадзіне ў Мінску каля Чырвонага касцёла сустрэчу моладзі з дэпутатамі Вярхоўнага Савета 12-га склікання, якія прымалі Дэкларацыю..

# РУХ “ЗА СВАБОДУ” ДЗЕЙНІЧАЕ

Міністэрства юстыцыі РБ адмовіла ў рэгістрацыі праваабарончага грамадскага аб’яднання “Рух “За Свабоду”. У афіцыйным лісце Мінюста, які прыйшоў заяўнікам 21 ліпеня, гаворыцца, што “шэраг палажэнняў статуту дадзенага грамадскага аб’яднання не адпавядае патрабаванням беларускага заканадаўства”.



Паводле заснавальнікаў арганізацыі, адмова з’яўляецца незаконнай і неабгрунтаванай. У адказе міністэрства не пазначана ніводная з прычынаў, якая магла б быць падставай для адмовы ў рэгістрацыі аб’яднання.

Лідэр Руху “За Свабоду” Аляксандр Мілінкевіч лічыць рашэнне Мінюста палітычна матываваным.

“Мы за легальную дзейнасць і калі ўлада пазбаўляе нас гэтага права, яна парушае закон, парушае нашы правы, якія прапісаныя ў Канстытуцыі. Гэта рашэнне ідзе ў агульным рэчышчы палітыкі ўлады, скіраванай на падаўленне грамадзянскай актыўнасці і закрыццё ўсіх легальных структур у краіне, акрамя тых, якія падкантрольныя ўладзе. Рашэнне Мінюсту – гэта таксама сведчанне для міжнародных і еўрапейскіх структураў пра тое, як выконваюцца правы чалавека ў Беларусі і ў якіх умовах існуе грамадзянская супольнасць у краіне.

Мы будзем і надалей праводзіць сходы заснавальнікаў, нягледзячы на перашкоды з боку ўлады, дамагацца рэгістрацыі і працягваць нашу дзейнасць, якую мы не звязваем з фактам рэгістрацыі”, — заявіў Аляксандр Мілінкевіч.

Устаноўчы сход грамадскага аб’яднання «Рух «За Свабоду» адбыўся ў Гродне 20 траўня. Яго кіраўніком абраны Аляксандр Мілінкевіч. Намеснікамі кіраўніка сталі Віктар Карняенка і Юрась Губарэвіч. Сярод галоўных кірункаў дзейнасці арганізацыі -- абарона правоў чалавека, пабудова грамадзянскай супольнасці, забеспячэнне незалежнасці і суверэнітэту, правядзенне свабодных і дэмакратычных выбараў.

Заснавальнікі руху будуць абскарджваць рашэнне Міністэрства юстыцыі ў Вярхоўным судзе РБ.

**Паводле прэс-службы РПГА “Рух “За Свабоду”**

**P.S.** *25 ліпеня лідэру Руху “За Свабоду” Аляксандру Мілінкевічу споўнілася 60 гадоў. Рэдакцыя газеты “Свабода” далучаецца да віншаванняў. Мы жадаем яму моцнага здароўя, плёну ў працы і палітычнага доўгажыхарства!*

Аляксандр Мілінкевіч нарадзіўся ў Гродне, скончыў там школу, працаваў настаўнікам. Кандыдат фізіка-матэматычных навук.

У 1990-1996-м г. быў намеснікам старшыні Гродзенскага гарвыканкама. У 2005-м годзе на Кангрэсе дэмакратычных сілаў быў абраны адзіным кандыдатам на прэзідэнцкіх выбарах.

# СУХАРЭНКА НА ВЁСЦЫ



Чуткі пра арышт былога кіраўніка КДБ Сцяпана Сухарэнкі, пра што пісалі многія незалежныя выданні, не пацвердзіліся. Прыканцы мінулага тыдня ў вёсцы Здудзічы Светлагорскага раёна, дзе жыве маці Сухарэнкі, яго адшукалі журналісты. “Калі мы прыехалі, ён разам з усёй сваёй сям’ёй сядзеў побач з бацькоўскім домам. Выгляд у яго быў такі звычайны. Ён кажа, што нікуды не знікаў, што ён адразу сабраў сваю сям’ю і з’ехаў да матулі. Да нядаўняга часу яны там усе разам адпачывалі”, — распавяла ў інтэрвью Радыё Свабода карэспандэнтка газеты “Народная воля” Марына Коктыш. Паводле яе словаў, Сцяпан Сухарэнка пагадзіўся на інтэрв’ю для “Народнай волі”, але адказваў не на ўсе пытанні. Прынамсі, ён не ведае сапраўднай прычыны адстаўкі і месца сваёй новай працы.

Калі прыехалі журналісты, побач з домам стаяла нейкая машына з антэнамі, кажа Марына Коктыш: “Ён сам звярнуў на яе ўвагу, сказаў, што гэтая машына з’явілася незадоўга да нашага прыезду. Потым, калі мы прыехалі й пачалі размаўляць, там яшчэ праехала машына, спынілася за некалькі метраў ад гэтага дому і вельмі так павольна праехала побач з намі, паглядзелі два хлопцы адтуль. Ён сам кажа, што за ім так глядзяць. Назіраюць”.

Маці Сцяпана Сухарэнкі жыве ў звычайнай хаце, без тэлефона. Побач – дом, дзе вырас кіраўнік тэлеканалу ОНТ Рыгор Кісель. З ім яны разам раслі, хадзілі ў школу.

Ці звязаная адстаўка Сухарэнкі са збіццём старшыні Дзяржкантролю Зянона Ломаця? (*Пра акалічнасці гэтага здарэння ў Магілёве мы пісалі ў мінулым нумары газеты* – рэд.) На гэтае пытанне Сухарэнка адказаў: калі б гэта была правакацыя супраць міністра ўнутраных справаў Уладзіміра Навумава, то ў ягонай сітуацыі цяпер апынуўся б Навумаў.

**Паводле РС**

# ТАЙНА ШАСЦІ МІЛЬЁНАЎ

## КАЛІ ЎЗНІКЛА СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯ?

Працяг са стар.1

што яна “такая-ж людская й панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо й іншая якая”, і што мы самі ўсе – беларусы, а Беларусь – гэта краіна “ад Вільні да Мазыра, ад Віцебска за малым не да Чарнігава”.

“Дудка беларуская” Ф.Багушэвіча ўпершыню выйшла ў свет у Кракаве ў 1891 годзе. А ў 1910 годзе выходзіць артыкул Антона Луцкевіча “Беларусы” ў зборніку “Формы национального движения в современных государствах” (Санкт-Пецярбург, 1910). І Луцкевіч пачынае сваю працу са статыстычнага факту: “Перапіс 1897 году налічвае ў Расійскай імперыі 5 885 547 беларусаў”.

Можна па-рознаму ставіцца да царскай статыстыкі. Але ніяк не выпадае амаль шэсць мільёнаў тых беларусаў разглядаць як статыстычную памылку. Пры гэтым самым пераканаўчым момантам тут з’яўляецца аўтарытэт Луцкевіча, які б не стаў пачынаць знаёмства асвечанай расійскай публікі з “новай нацыяй” лічбамі, якія лічыў фальшывымі. Вось як ён сам пракаментаваў прыведзеную лічбу:

“Аднак лічба гэтая наўрад ці можа лічыцца дакладнай; розныя меркаванні мясцовай палітыкі, перадузятасць, з якой падыходзілі да збірання звестак арганізатары перапісу, адсутнасць нацыянальнай самасвядомасці сярод шырокіх народных мас, — усё гэта робіць звесткі пра нацыянальны склад наагул, а ў прыватнасці пра лік беларусаў маладаставернымі.

Больш даверу заслугоўваюць навуковыя даследаванні ў гэтым пытанні, якія належаць праф. Карскаму, які, кіруючыся лінгвістычнымі асаблівасцямі беларусаў, налічвае іх колькасць у Беларусі лічбаю больш за 8 мільёнаў”.

Луцкевіч гаворыць пра заніжэнне лічбы афіцыйнага перапісу, але не аспрэчвае “якасці” тых амаль шасці мільёнаў. Зрэшты, было б малаверагодна, калі б у часы афіцыйнай забароны беларускай мовы і самой назвы Беларусі, афіцыйная статыстыка маніпулявала з лічбай беларусаў у бок яе павелічэння. Нават калі б у нейкай мясцовасці гэта было ўладам выгадна (напрыклад, каб не запісваць людзей “палякамі”, пры тым, што запісаць іх “рускімі” было б яўным скажэннем), мы не атрымалі б настолькі вялікай лічбы. Але нават калі б яна ў рэальнасці была меншай, бясспрэчна, што доля тых у ёй, хто назваў сябе беларусам усвядомлена, была значнай.

* * *

А вось як каментуе звесткі таго перапісу сучасны даследчык Павел Церашковіч:

“На працягу 2-й паловы 19 стагоддзя ў этнічнай самасвядомасці беларусаў адбыліся істотныя змены. Паводле перапісу 1897 году, 74% насельніцтва Беларусі лічылі роднай мовай беларускую. Да беларусаў сябе адносілі каля 43% саслоўя дваран. Роднай мовай беларускую лічылі 40% чыноўнікаў, 10% юрыстаў, 20% лекараў, 29% паштова-тэлеграфных службоўцаў, 60% настаўнікаў. Сярод сялянства назва “беларусы” выцесніла большасць лакальных этніконаў. Тэрмін Беларусь замацаваўся за ўсёй этнічнай тэрыторыяй Беларусі”.

Выглядае, што ў цэлым нацыянальная даспеласць беларусаў у 1897 годзе была параўнальная з сённяшняй, а зусім не адрознівалася радыкальна і, тым больш, не адсутнічала наогул, што сцвярджала пасля савецкая ідэалогія і што трывала замацавалася ў свядомасці не толькі паспалітых беларусаў, але і прафесійных даследчыкаў.

У сучаснай свядомасці беларусаў з савецкіх часоў пашыранае ўяўленне, быццам сама беларуская нацыя была плёнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, прынамсі ўзнікла пасля яе. Перапіс 1897 году аспрэчвае гэты тэзіс і тлумачыць, адкуль, з якога асяроддзя, на якім падмурку сфармавалася сучасная беларуская нацыя. Мы можам з лёгкасцю ўявіць наступную гісторыю – што з гэтымі шасцю мільёнамі станецца ў будучыні. Чаго мы пакуль уявіць не можам, чаго не тлумачыць перапіс і не праясняюць наяўныя трактоўкі гісторыкаў – адкуль тыя шэсць мільёнаў узяліся.

* * *

Зразумела, што ў масе сваёй яны не чыталі Багушэвіча. Іхняй беларускасці іх не вучылі ў школе. І саміх школ беларускіх не існавала, як не існавала па-беларуску газет, тэатраў, багаслужбаў... Прынамсі, гэтак мы сабе той час уяўляем. І жылі тыя людзі не ў Беларусі, а ў Паўночна-Заходнім краі. І ніякае ранейшае Беларусі яны не ведалі, бо, як мы ўжо казалі, ніколі ў гісторыі ніякай Беларусі й не было. І тут раптам – шэсць мільёнаў беларусаў і сярод іх – дваране і лекары з настаўнікамі, для якіх беларуская мова родная... Зусім кандыцыйная як для еўрапейскай нацыі напрыканцы 19 ст. колькасць і якасць. Гэта здзіўляе, бо ў сучасных даследчыкаў беларускай гісторыі таго перыяду даўно сфармаваўся стэрэатып, што ўсіх, хто ў тагачаснай Беларусі мог заявіць пра сябе, як пра беларуса, мы ведаем ледзьве не пайменна.

Такі стэрэатып – вынік таго, што кожнае новае пакаленне беларусазнаўцаў (у тым ліку і сённяшняе) выходзіла не са школы, а нараджалася “зрухам сэрца” і кожны даследчык або паэт пачуваўся сам сабе Багушэвічам – першапраходцам. Школа і пераемнасць ведаў усяляк разбураліся на працягу 20 стагоддзя, тэксты папярэднікаў забараняліся і падлягалі знішчэнню, а самі іх аўтары часта рэпрэсаваліся. Вось чаму ў беларушчыне ўмацавалася агульнае адчуванне, што кожны новы даследчык або паэт пачынае “з чыстага ліста”. І гэты “чысты ліст” – 19 стагоддзе. А тут аказваецца, што на лісце тым не пустата, а – ажно 6 мільёнаў.

* * *

Першую згадку Беларусі гісторыкі знаходзяць у матэрыялах 13 ст. На працягу наступнай гісторыі гэтае імя вандравала па розных краях, пакуль не спынілася на ўсходніх землях сённяшняй беларускай тэрыторыі. Гэты працэс і гэтую гісторыю мы пакідаем за рамкамі нашага артыкула, бо да “зрухаў сэрца” яны не маюць непасрэднага дачынення. Калі Ян Баршчэўскі назваў свой чатырохтомнік “Шляхціц Завальня або Беларусь у фантастычных апавяданнях” (1844–1846), ён меў на ўвазе родную Віцебшчыну. Калі Іван Насовіч выдаваў свой “Словарь белорусского наречия” (1870), ён асацыяваў Беларусь з роднай Магілёшчынай.

Дзясяткі й сотні падобных выпадкаў ужывання назваў “Беларусь” і “беларускі” ў дачыненні да сённяшніх усходнебеларускіх земляў адносіліся толькі да тэрыторыі, а сваім зместам адпавядалі ідэі рэгіяналізму. Гэта значыць, да сучаснага разумення нацыі не дацягвалі. Але частотнасць ужывання гэтых назваў дазваляе дапусціць, што не заўсёды яны мелі толькі тэрытарыяльны або краёвы змест. Верагодна, мы маем справу з эвалюцыяй саманазывання ад тэрытарыяльнай, канфесійнай, дзяржаўнай ці якой іншай прыналежнасці да нацыянальнай самаідэнтыфікацыі.

Літаратар і даследчык Кастусь Цвірка прыводзіць такі прыклад у зборніку “Філаматы і філарэты”:

“Францішак Малеўскі, як і ўсе філаматы і філарэты, з вялікай пашанай ставіўся да

Працяг на стар.5

# ТАЙНА ШАСЦІ МІЛЬЁНАЎ

## КАЛІ ЎЗНІКЛА СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯ?

**Працяг са стар.4**

фальклору, да мовы свайго беларускага народа, што таксама праявілася ў “Tygodniku Petersburskim”. Гартаючы тыя нешматлікія нумары газеты, якія захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, я нечакана натрапіў на даволі цікавую ў гэтых адносінах публікацыю ў нумары 95 за 1835 год. Гэта агляд кнігі, якая выйшла ў той час на беларускай мове і называлася “Кароткі зборнік хрысціянскай навукі для сялян, якія размаўляюць на руска-польскай мове”. Безыменны аўтар агляду гэтай кнігі, выказваючы сваё задавальненне з прычыны яе выхаду, зазначаў: “Першы раз здараецца нам бачыць кнігу, напісаную на гаворцы, на якой размаўляе просты люд у Літве і Беларусі. Гэта – малавядомая частка роднай нашай мовы, якая распаўсюджана на шырокай прасторы зямлі і якая сведчыць пра рускае паходжанне яе жыхароў. Гаворку гэтую правільна называць не польска-рускай, а беларускай...” Думаецца, аўтарам гэтага агляду беларускай кнігі быў не хто іншы, як сам Францішак Малеўскі”.

Такім чынам, задоўга да Ф.Багушэвіча ледзьве не тымі самымі словамі – гэта значыць, у нашым сучасным разуменні – пра беларускую мову выказаўся Ф.Малеўскі. Праўда, ён жа акрэсліў і той эвалюцыйны фон, на якім паўставалі наватворы “беларус” і “беларускі”.

Інакш кажучы, тут мы набліжаемся да “чыстага ліста”, бо “малавядомая частка мовы” і “рускае паходжанне жыхароў” – гэта і ёсць поўная адсутнасць беларускай ідэі.

Выходзіць, што менавіта за гэты прамежак часу – ад 1835 да 1897 году на нашым “лісце” і з’явіліся шэсць мільёнаў беларусаў. Магчыма, так яно і было, калі паверыць у пасіянарную сілу нацыянальнага самаўсведамлення, што па ўсім свеце прыпала якраз




**Надпіс на дарэвалюцыйнай** *паштоўцы: Белоруссы. "Каковы уродились - таковы и есть! Кто кому миленек - и не умыт беленек"*

на гэты час. Але сіла гэтая ў нашым выпадку мусіла быць проста непраўдападобнай, бо нішто ў краі не спрыяла таму, каб людзі пачалі масава называць сябе беларусамі. На далучаных да расійскай імперыі землях Вялікага Княства Літоўскага адбывалася планамерная русіфікацыя. Быў зачынены Віленскі ўніверсітэт, найбольш актыўная пратэстная частка насельніцтва рэпрэсавалася, мноства такіх было забіта і саслана ў Сібір альбо ратавалася на эміграцыі. Тым часам абсалютная большасць народу стаілася і думала толькі пра самазахаванне, імкнулася ніяк не выяўляць сябе, не тое што горда заявіць урадаваму перапісчыку: “Я – беларус”.

* * *

Пасля паўстання 1863 году і без таго неспрыяльныя для беларускай самаідэнтыфікацыі ўмовы пагоршыліся шматкроць. Варта ўявіць сабе атмасферу, што запанавала ў акупаваных наезджай расійскай бюракратыяй землях, каб зразумець, што не толькі росту самасвядомасці не магло быць, але і тым, хто ўсвядоміў сябе беларусам, лепей было схавацца за найменне “рускага” або “тутэйшага”. Вось як характарызуе гэты фон сучасніца падзей – Н.Ланская ў сваёй кнізе “Обрусители” (1887):

“Некалькі гадоў таму заходні край быў цэнтрам, куды сцякалася вялікае мноства людзей вялікарускага паходжання пераважна і праваслаўнага вызнання абавязкова. У той час край уяўляў сабою арэну, дзе, нічым не рызыкуючы, можна было тысячу разоў вылучыцца, выйсці, што называецца, у людзі і пасля, супакоіўшыся на лаўрах, вымавіць з спакойным сумленнем: мы абрусілі. Сюды імкнуліся ўсе тыя, хто быў чымсьці не задаволены ў сябе ўдома: кожны, каго абышлі чынам, месцам ці ўзнагародай, чый не прынялі ці вярнулі праект, чый маёнтак, у выніку новых парадкаў, прыйшоў у заняпад, а ўзяцца за справу не было ні ўмення, ні сілы – усё гэта спяшалася ў заходні край. Тутака сцякаліся людзі ўсялякіх прафесій, узростаў і станаў: маладыя, старыя, аматары пажыць і тыя, што пражыліся дазвання, расчараваныя ў каханні, падманутыя ў жыцці і што самі падманвалі, – усе пнуліся сюды з ліхаманкавай паспешлівасцю...

Атэстатаў аніякіх не патрабавалася: дастаткова было прыехаць з Расіі і заявіць сябе праваслаўным, каб атрымаць права на такія льготы, правы і перавагі, якія ператвараліся ў сапраўдны рог дастатку. Можна таму ўявіць, якая колькасць рознае навалачы запаланіла гэтыя бядотныя 9 губерняў! Які кантынгент ілжы, подласці, усялякіх падманаў, подкупаў, фальшу і маральнае распусты прынесла з сабой гэтая праваслаўная армія згаладалых, сасмяглых і нецярплівых! Нібы саранча, кінуліся яны на гатовыя месцы, спяшаючыся захапіць усю тую прастору, ачышчаную для іх гвалтам; цырымоніцца не было патрэбы, і пад выглядам абрусення і прапаганды праваслаўя гэтыя заваёўнікі пераследавалі такія мэты, якія не мелі нічога супольнага ні з рэлігіяй, ні з маральнасцю, ні нават з палітыкай сапраўднага абрусення...”.

Парадокс! Аўтарка не ўжывае тэрмінаў “беларусы” і “Беларусь”. Але апісвае якраз той “чысты ліст”, на якім, нібыта, у гэты самы час “вымалёўваліся” нашы шэсць

**Заканчэнне на стар.7**

# ТРУНА З КАНДЫЦЫЯНЕРАМ

Саюздрук

## АЛЬБО ПА КІМ ПЛАЧУЦЬ НАВІНКІ



Найбольш вартыя ўвагі матэрыялы, як мне падалося, на мінулым тыдні надрукаваныя ў газеце "Рэспубліка". Возьмем, напрыклад, інтэрв"ю вядомага расійскага мастака Міхаіла Шэмякіна, які ўпрыгожыў сваёю персонай "Славянскі базар":

*"Я был приглашен и с великой охотой приехал на фестиваль. Во-первых, много о нем слышал и сейчас убедился, что это очень интересная традиция. А во-вторых, я приехал с предложением открыть в Беларуси филиал своего института философии и психологии творчества. Возможно, здесь появится и ювелирная мастерская, в создании которой я мог бы принять участие. Эти идеи мы обсуждали во время встречи с Президентом Беларуси.*

*Что касается впечатлений, то я увидел, например, замечательное, на мой взгляд, сооружение амфитеатра с великолепной в архитектурном плане крышей. Кстати, поздним вечером, возвращаясь после концерта домой пешком (движение машин было перекрыто), обратил внимание на гуляющую по городу молодежь и вспомнил, как совсем недавно мне пришлось побывать на большом молодежном празднике в Петербурге. Там мне посоветовали даже не вылезать из машины, потому что повсюду совершенно пьяные подростки, разбитые бутылки, много людей с окровавленными лицами… По ночному фестивальному Витебску я шел очень спокойно и чувствовал себя уютно в толпе людей".*

Калі на "Славянскі базар" прыязджае вядомы маскоўскі мастак, які спецыялізуецца на парадных партрэтах начальства, Нікас Сафронаў, каб пісаць Лукашэнку, тут усё зразумела. Але калі на свята папсы завітвае мастак-нонканфарміст (так за савецкім часам называлі тых, чыя творчасць не ўпісвалася ў парадны "сацрэалізм") Шэмякін, ды яшчэ захапляецца дахам амфітэатра ў горадзе Шагала, ды яшчэ абмяркоўвае з кіраўнікам дзяржавы нейкія філасофскія ідэі... А можа, скульптар, вядомы яшчэ і сваімі нестандартнымі манерамі ды "прыколамі" проста пажартаваў? Але жарт атрымаўся нейкі нясмешны.

Шмат цікавай і забаўнай інфармацыі паведаміў пакуль яшчэ жывым чытачам "Рэспублікі" Старшыня Савета дырэктароў пахавальных арганізацый Беларусі Мікалай Раткевіч:

*"При выборе гроба многое зависит от денег в кошельке. Ценовая разбежка — от 115 тысяч до 3 миллионов рублей. Пользуются спросом обитые светлой тканью или лакированные гробы-купе. На Западе и в России можно изготовить гроб по индивидуальным заказам не только в виде спортивных и туристических сумок и мусорных контейнеров, но и музыкальных инструментов, зверей, транспортных средств, бутылок…*

*Сейчас на Западе и в России гробы – это настоящие произведения искусства, заказы бывают очень необычными, их стоимость доходит до 20 тысяч у.е Одна из минских молодых семей хоронила отца. Они предполагали, что умерший не ушел от них навсегда, а, возможно, уснул крепким летаргическим сном. И хотели заказать гроб с кондиционером, полочкой для мобильного телефона и трубкой для свежего воздуха. Цена их не смущала, однако пришлось отказать".*

Карацей, ні сябра ў "бутэльцы" не пахаваеш, ні ворага ў "сметніку". І ў гэтай сферы наша Беларусь – адзіны фарпост здаровага сэнсу. Ці-то парушэння правоў нябожчыка. Бо нават пасля смерці мінчук залежыць ад начальства – у дадзеным выпадку, ад галоўнага далакопа рэспублікі спадара Раткевіча. А памірае, між іншым, у сталіцы каля сарака чалавек штодня.

А палітычны агләдальнік "Рэспублікі" Яўген Росцікаў – відаць, за адсутнасцю іншых тэмаў, усё піша пра Кангрэс дэмакратычных сілаў, які адбыўся сёлета ў траўні.

*"Прошедший в мае конгресс наглядно продемонстрировал, кто в оппозиции сегодня правит бал. Не помогли Милинкевичу ни «условно-досрочно» прилетевшие на конгресс Статкевич и Северинец, ни вопли активистов «Молодого фронта» и прочих поддерживающих его группировок из молодежных структур. (…)*

*Но амбиции, взыграв, уже не позволяют ему остановиться. Остапа, как говорится, понесло. «Я политик и одновременно гражданский лидер, — объявляет Милинкевич в распространенном недавно заявлении. И продолжает: — Считаю, что в нынешних условиях именно мне отведена миссия консолидации широкого демократического общества».*

*Вот так, ни больше ни меньше! Как говорится, скромненько, но со вкусом. Миссионер – это еще куда ни шло, их немало было на нашем веку. Привыкли. Вот когда этот господин объявит себя «мессией» (до этого, похоже, не так далеко), тут уж специалистам из Новинок надо быть начеку".*

Відаць, паля таго, як у Беларусі была забароненая сатырычная газета "Навінкі", яе высакародную місію ўзваліла на сябе "Рэспубліка". Яе аўтары прымаюць чытачоў за пацыентаў, а саміх сябе трымаюць за лекараў. Працуюць, што называецца, на мяжы нервовага зрыву. Што ж, як кажа ў такіх выпадках адзін мой знаёмы, "за чужы дыягназ не адказваю".

**Алесь Канюціч**

**РЭДАКЦЫЯ "СВАБОДЫ" ІМКНЕЦЦА ЗРАБІЦЬ ГАЗЕТУ ПАТРЭБНАЙ ВАМ.**

**МЫ ПІШАМ БЕЗ ЦЭНЗУРЫ І ГАТОВЫЯ ГАВАРЫЦЬ ПРА САМАЕ ВАЖНАЕ І НАБАЛЕЛАЕ, ШТО ХВАЛЮЕ І ЦІКАВІЦЬ ВАС.**

**З ТАКОЙ ПАЗІЦЫЯЙ АДЗІНАЕ, ЧАГО МЫ НЕ МАЕМ І НЕ МОЖАМ МЕЦЬ У СЁННЯШНЯЙ БЕЛАРУСІ – АФІЦЫЙНАЙ РЭГІСТРАЦЫІ І МАГЧЫМАСЦІ АДКРЫТА РАСПАЎСЮДЖВАЦЦА ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ. АДНАК ГЭТА НЕ ПАВІННА ПАЗБАЎЛЯЦЬ ВАС І НАС ГАЛОЎНАГА: ВАС – ПРАЎДЗІВАЙ І ПОЎНАЙ ІНФАРМАЦЫІ, НАС – ЗВАРОТНАЙ СУВЯЗІ З ВАМІ.**

**МЫ З НЕЦЯРПЛІВАСЦЮ БУДЗЕМ ЧАКАЦЬ ВАШЫХ ПЫТАННЯЎ, ПАЖАДАННЯЎ І ЗАЎВАГ У ЛІСТАХ НА НАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС (EDIT@VILNIA.COM) АЛЬБО Ў SMS-ПАВЕДАМЛЕННЯХ (НЕ ЗВАНКАХ!) НА НУМАР +37068742185.**

# ТАЙНА ШАСЦІ МІЛЬЁНАЎ

## КАЛІ ЎЗНІКЛА СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯ?

**Заканчэнне. Пачатак на стар.1,4,5**

мільёнаў.

А можа, гэта ўсё гістарычная фантастыка і не было ніякага "чыстага ліста"?

* * *

Прыведзеная вышэй цытата з Ф.Малеўскага ўскосна пацвярджае версію пра першапачатковае ўзнікненне беларускай нацыянальнай ідэі ў асяродку віленскіх студэнтаў пачатку 19 ст., дакладней, у таемных таварыствах філаматаў і філарэтаў. Менавіта там "зрухі сэрца" з ірацыянальнага пачуцця роднасці былі пераведзеныя ў рацыянальную плоскасць нашага сучаснага разумення нацыі. Хто быў тым першым аўтарам: Міцкевіч, Чачот, Зан, Дамейка ці Адынец, — мы не ведаем. Але пэўна, што ён быў сярод іх.

Вядомыя факты пра Адама Міцкевіча, які пазней у сваёй лекцыі ў Калеж дэ Франс назаве беларускую мову самай чыстай і з усіх славянскіх найменш зменаенай. Пра Антона Адынца, які будзе намаўляць Вярыгу-Дарэўскага, каб той рабіў літаратурную кар'еру не па-польску, а па-беларуску. Пра Яна Чачота, які збіраў і выдаваў беларускія народныя песні, называючы мову гэтых песень славяна-крывіцкай.

Характэрны прыклад актыўнага пошуку свайго нацыянальнага самаазначэння ў філамацкім асяродку – ліст Яна Чачота да Ануфрыя Петрашкевіча з далёкага расійскага Кізілу у 1825 годзе, дзе Чачот апісвае становішча сваё і калег-філаматаў, што былі асуджаныя на ссылку за вальнадумства, і, паміж іншым, заўважае:

"Цяпер аранбурская лінія, можна сказаць, запруджана палякамі (так нас называюць тут і за такіх прымаюць)".

Філаматы і філарэты, што з'явіліся ў Віленскім універсітэце ў 1817 годзе, сталі тым творчым асяродкам, які фактычна "прыдумаў Беларусь" – у яе сучасным разуменні. Прынамсі, яны ўшчыльную падышлі да гэтага вызначэння. Палякамі іх лічылі за шляхецкае паходжанне, каталіцкае веравызнанне і польскую мову, на якой яны пісалі свае творы. Самі ж яны лічылі сябе ліцьвінамі, а айчынай называлі Літву. І разам з тым, усе так ці інакш дакраналіся да найменняў "беларускі" і "Беларусь". Заставалася зрабіць гэты апошні выразны крок, каб іхнія зрухі сэрца абазначыліся адным словам і пачала фармавацца новая супольнасць.

Аднак, што адбылося далей, мы не ведаем. Мы маем справу з гістарычным правалам шырынёй у паўстагоддзя, на адным краі якога першыя нясмелыя спробы назваць мову беларускай, а на другім – шэсць мільёнаў чалавек, якія называюць беларускую мову роднай, а сябе – беларусамі.

Праблема "чыстага ліста" і пераемнасці, магчыма, заключаецца ў пункце гледжання, у ракурсе гістарычнага даследавання і адсутнасці канцэпцыі, якая б арыентавалася не на "чысты ліст", а на гэтыя самыя шэсць мільёнаў і раскрыццё іхняе таямніцы. Беларусаў у сярэднявеччы магло не быць не таму, што не было сучаснага разумення нацыі і не таму, што называліся яны неяк па-іншаму – русінамі, літвінамі – а таму, што праз акуляры цяперашніх фрагментарных гістарычных канцэпцый мы іх там яшчэ не разгледзелі.

Мы дагэтуль складаем сваю гістарычную мазаіку з кавалкаў даўніх польскіх альбо расійскіх канцэпцый, і самі, як нацыя, на стыках некуды прападаем. Мы ўрэшце пагадзіліся, што наша эвалюцыя не была суцэльнай і ў кожнай гістарычнай эпосе мы знаходзім сябе пад іншым імем, і кожнага разу шукаем новыя аргументы, каб даказаць генеалагічную датычнасць сучасных беларусаў да тых даўніх продкаў.

У выніку сама беларуская ідэя выглядае такой вось мазаікай розных "зрухаў сэрца", дзе на стыках паміж каляровымі шкламі з'яўляюцца правалы, у якіх знікаюць мільёны нашых папярэднікаў-беларусаў.

**Сяргей Дубавец**

## Фотафакт



**На музычным фэстывалі** *"Басовішча", Гродэк, 22 ліпеня 2007 году. Здымак* *zedlik.livejournal.com*

## Невядомая Беларусь

**26 ліпеня** 1989 году ў Мінску адбыўся масавы мітынг грамадзянаў, які патрабаваў стварэння следчай камісіі ў справе ўтойвання інфармацыі пра Чарнобыль. Мінула больш за 15 гадоў, але ніхто з вінаватых так і не быў пакараны.

**27 ліпеня** 1941 году ў Мінску выйшаў у свет першы нумар "Беларускай газэты". Яна выдавалася на працягу ўсяго перыяду нямецкае акупацыі, асвятляла падзеі ў Беларусі і свеце з гледзішча нямецкага камандавання, адначасова шмат друкавала матэрыялаў з беларускае гісторыі і культуры, асабліва тых, што былі забароненыя савецкай цэнзурай. Некалькі работнікаў "Беларускай газэты" былі забітыя савецкімі тайнымі агентамі.

**28 ліпеня** 1997 году пакінуў гэты свет Лявон Луцкевіч, які сам сябе называў старым віленчуком, бо ўсё сваё жыццё прысвяціў збіранню фактаў, што сведчылі пра беларускую гісторыю Вільні – яе герояў і дзеячоў. Пяру Лявона Луцкевіча належыць кніга "Вандроўкі па Вільні".

**30 ліпеня** ў 1840 годзе расійскі цар Мікалай І выдаў указ, у якім забараніў выкарыстанне слова «Беларусь». Цяпер нашу краіну афіцыйна трэба было называць «губернямі Паўночна-Заходняга краю».

**31 ліпеня** ў 1944 годзе ў Беларусі пачалася маштабная аперацыя НКВД з мэтаю ліквідацыі ў заходніх раёнах узброенага падполля. Усяго за год было арыштавана амаль сто тысяч чалавек. Забіта пры супраціве тры тысячы дзвесце змагароў з савецкаю ўладай.

**1 жніўня** ў 1857 годзе людзі ў Беларусі зведалі чарговае наступства далучэння краіны да Расійскай імперыі. Выйшаў указ расійскага цара, паводле якога аднадворцы, гэта значыць бедная шляхта, былі аднесены да катэгорыі дзяржаўных сялян. Такім чынам былі паніжаныя ў правах 44 тысячы 800 сем'яў.

# БЕЛАРУСКАЯ РУЛЕТКА

## ЦІ ПЕРАТВОРЫЦЦА МІНСК У ЛАС-ВЕГАС?

Рашэнне расійскіх уладаў вынесці да 2009 году ўсе казіно з буйных гарадоў у чатыры аддаленыя зоны з цікавасцю было сустрэтае ў Беларусі. Пэўныя колы ў нашым кіраўніцтве і бізнэсе адразу пабачылі для сябе выдатныя магчымасці.

Натуральна, што, хоць у нас на паперы існуе так званая “саюзная дзяржава”, згаданае рашэнне на тэрыторыю Беларусі не распаўсюджваецца. Таму мінскія казіно, у адрозненне ад маскоўскіх ці піцерскіх, зачыняцца не збіраюцца.

Такім чынам, у 2009 годзе перад расійскімі аматарамі азартных гульняў паўстане выбар: або ехаць у нейкі Мухасранск, або наведаць сталіцу еўрапейскай дзяржавы. Тым больш, што дабрацца да Мінска, прыкладам, з Масквы можна за гадзіну самалётам ці за ноч цягніком.



**Казіно ў Мінску**, *фота з архіву.*

Відавочна, што значная частка гульцоў аддасць перавагу другому варыянту. Таму ўжо цяпер варта рыхтавацца да будучага наплыву. Трэба будаваць новыя казіно, бо цяперашнія наўрад ці будуць здольныя задаволіць попыт, які рэзка ўзрасце за кошт расійцаў. І збіраць з іх грошы ў бюджэт, ну, і трошкі тым чыноўнікам, якія будуць выдаваць адпаведныя дазволы.

Аднак папярэджаннем для тых, хто марыць пра “Лас-Вегас у Беларусі”, прагучалі на мінулым тыдні стрэлы у цэнтры Мінска. Наведнік казіно, што месціцца на вуліцы Няміга, будучы нападпітку, выйшаў на вуліцу і там пачаў чапляцца да мінака. Калі той сеў у таксі, аматар азартных гульняў з сябрамі на асабістым аўтамабілі пагналіся за ім. Урэшце бамбіза пачаў страляць у хлопца, які чымсьці яму не спадабаўся, з пісталета. Дзякуй Богу, што з пнеўматычнага.

Трэба памятаць, што азартныя гульні – гэта не толькі вялікія грошы, але і вялікі крымінал. Калі ў нашы казіно пачнуць масава ездзіць расійцы з іх добра вядомымі звычкамі, гісторыя са страляніной з пнеўматычнага пісталета ў цэнтры Мінска пададуцца добрай дзіцячай казкай. І меркаваныя прыбыткі абернуцца такімі стратамі, што адыграцца мы наўрад ці здолеем.

Таму да падобных гешэфтаў заўсёды трэба ставіцца з вялікай насцярожанасцю. Спакусіцца на азартную гульню лёгка, перамагчы ў ёй – цяжка.

**Валер Філін**

Наступны нумар газеты “Свабода” выйдзе 9-га жніўня

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ СВАБОДУ ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС
(ІНДЭКС, ГОРАД, ВУЛІЦА, ДОМ І КВАТЭРА)
SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185 АЛЬБО НА E-MAIL: EDIT@VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ СВАБОДУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ СВАБОДЫ, ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL EDIT@VILNIA.COM ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Тыраж** 299 экзэмпляраў
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: edit@vilnia.com) **Падпісана ў друк** 25.07.2007 00:54
**Адрас** 220013 г. Мінск, пл.Каліноўскага 1а